# Урок матэматыкі па тэме “Складанне і адніманне ў межах 7 на практычнай аснове” (1 клас)

**Ала Мікалаеўна Церах**
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Махнавіцкай сярэдняй школы Мазырскага раёна

**Падчас урока вучні замацуюць веды па тэме “Складанне і адніманне ў межах 7 на практычнай аснове”. Дыдактычныя матэрыялы, элементы творчасці дапамогуць вырашыць гэтую задачу цікава і нязмушаа. Плануецца, што ў канцы ўрока вучні будуць умець выконваць арыфметычныя дзеянні з лікамі ў межах 7.**

**Тэма:** Складанне і адніманне ў межах 7 на практычнай аснове. Замацаванне.

**Мэта:** замацаванне ўмення выконваць арыфметычныя дзеянні з лікамі ў межах 7 на практычнай аснове.

**Задачы:**

удасканальваць уменне рашаць простыя задачы, якія раскрываюць сэнс дзеянняў складання і аднімання, вылічальныя навыкі, уменне параўноўваць лікі;

развіваць увагу, мысленне, кемлівасць, пазнавальную актыўнасць;

выхоўваць паважлівае стаўленне да прыроды.

**Тып урока:** урок замацавання вывучанага матэрыялу.

**Формы дзейнасці навучэнцаў:** індывідуальная, франтальная, парная, групавая.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік “Матэматыка. 1 клас. Частка 1” (Г.Л. Мураўёва, М.А. Урбан. – Мінск: Акадэмія адукацыі, 2024); малюнкі з выявамі лесавіка, зубра, птушак з домікамі, ваўка, мядзведзя, вожыка, ваверкі, савы; домікі для гульні “Засялі домік”, палоскі паперы для гульні “Матэматычны спрынт”; карткі з заданнямі; сняжынкі для фізкультхвілінкі; кветкі для рэфлексіі.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны этап

**Настаўнік.** Вітаем усіх, хто час знайшоў і на ўрок да нас сёння прыйшоў.

Мы будзем на ўроку думаць? *(Так.)*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

А можа, будзем спаць? *(Не.)*
Мы будзем разважаць? *(Так.)*
А ў аблоках лётаць? *(Не.)*
Адзін аднаму будзем дапамагаць? *(Так.)*
– Усміхніцеся адзін аднаму і за працу.

**II. Этап падрыхтоўкі вучняў да працы на асноўным этапе.**

***Паведамленне тэмы ўрока.***

**Настаўнік.** Сёння мы адправімся на прагулку ў лес. Шлях наш будзе цікавы і поўны выпрабаванняў. Па дарозе мы замацуем уменне параўноўваць лікі, рашаць прыклады і задачы. Прайсці гэты шлях зможа толькі той, хто шмат ведае і сябруе з матэматыкай. А ў канцы прагулкі нас будзе чакаць незвычайны скарб. А вы ведаеце, што такое скарб? *(Штосьці каштоўнае, цэннае.)* Каб настроіцца на работу, мы крыху паразважаем і адкажам на пытанні.

**Прыём «Мазгавы штурм»**

Якая сёння дата?
Які сёння дзень тыдня?
Які ён па ліку?
Калі сёння чацвер, то які дзень тыдня будзе заўтра?
Якая зараз пара года?
Колькі ўсіх пор года?
Які зараз месяц?
Якое самае любімае свята мы адзначаем у гэтым месяцы?

**Вуснае лічэнне.**

**Настаўнік.** Падарожнічаць аднаму сумна, таму патрэбна ўзяць з сабой сяброў. А каго мы возьмем у падарожжа, вы даведаецеся, калі папрацуеце ў групе. Спачатку давайце разам палічым.

*(Лічэнне ў межах 20 уперад і назад.)*

Палічыце хлапкамі ад 8 да 14.
Палічыце ад 10 да 1, стукаючы алоўкам па далоні.
Пастаўце на дошцы лікі ў парадку павелічэння. *(Лікі: 1, 3, 2, 5, 6, 4, 7.)*

*Вучні выходзяць да дошкі, бяруць патрэбную лічбу і чытаюць пра яе верш.*

Пазнаёмцеся: адзінка,
Тонкая, нібы травінка.

Двойка, ейная сяброўка,
Выгінае шыю лоўка.

З двух маладзікоў, сябры,

Атрымаем лічбу тры.

Крэсла дагары нагамі —
Вось чацвёрка перад намі.

Тут кручок, а зверху хвосцік —
Лічбу пяць чакаем ў госці.

Лічбу шэсць дугой сагнулі,
Быццам люльку у дзядулі.

Лічбу сем напішам разам,
З чубам і прыгожым пасам.

**Настаўнік.** Назавіце найменшы лік? Найбольшы? Назавіце суседзяў ліку 3. Які лік знаходзіцца паміж лікамі 3 і 5? Дзе ў жыцці мы можам сустрэцца з лічбай 7? Назавіце лікі, пры складанні якіх атрымліваецца 7.

**Настаўнік.** Перавярніце лікі і прачытайце, хто сёння прыйшоў да нас на ўрок. *(Лесавік.)*

*Настаўнік на дошку вывешвае малюнак з выявай лесавіка.*

**Настаўнік.** Лесавік сочыць за парадкам у лесе. Калі наведвальнік лесу мае дрэнныя намеры: крыўдзіць птушак ці звяроў, ломіць дрэвы, знішчае кветкі, то лесавік можа яго пакараць. Сёння ён будзе сачыць за вашымі паводзінамі падчас прагулкі, а таксама паглядзіць, як вы добра засвоілі папярэднія тэмы па матэматыцы. Таму вам патрэбна быць вельмі ўважлівымі, старыннымі і адказнымі. А вы ведаеце як патрэбна паводзіць сябе ў лесе? *(Адказы вучняў.)*

**III. Этап замацавання новых ведаў і спосабаў дзеяння**

**Настаўнік.** Каб адправіцца на прагулку, патрэбна цёпла апрануцца. Перад вамі шапачкі з лікамі. Неабходна да гэтых лікаў падабраць суседзяў, якія размешчаны на шаліках і рукавічках. *(Вучні выконваюць заданне.)*

**Настаўнік.** Вось цяпер можна адпраўляцца на прагулку. Адгадайце, хто першы сустракае нас на прагулцы.

Гэта князь вялікай пушчы,
Сам вялікі, моцны, дужы,
Абаронца ён спакойны
Ўсіх гаёў, гушчараў хвойных. *(Зубр.)*

**Настаўнік.** Зубр – гэта сімвал працавітасці і жыццёвай сілы. Зубр у Беларусі з'яўляецца не толькі прадстаўніком багатага, разнастайнага

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

жывёльнага свету, але і сімвалам нашай краіны. Гэта магутная і моцная жывёла занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

**Настаўнік.** Зубр прапануе пагуляць у гульню “Засялі домік”. “Засяліць” домікі патрэбна такім чынам, каб сума лікаў у кожным радку была роўная ліку, адлюстраванаму на даху доміка. Каб паспяхова справіцца з гэтым заданнем патрэбна ўспомніць састаў ліку.

*Вучні па чарзе выходзяць да дошкі і выконваюць заданне.*

**Настаўнік.** Паглядзіце колькі на дошцы птушак! Але чаму яны не ляцяць у свае домікі? *(Адказы вучняў.)* Птушкі так загуляліся, закружыліся, што забылі нумар доміка. Дапаможам ім трапіць дадому? Для гэтага патрэбна рашыць прыклады. А адказ і будзе нумарам доміка.

**Настаўнік.** А чаму птушкі ляцяць у вырай? Як чалавек можа дапамагчы птушкам зімой? *(Зрабіць кармушкі, развесіць іх на дрэвах, насыпаць корм.)*

**Фізкультхвілінка**

**Настаўнік.** Стаміўся лесавік і прапануе адпачыць. Зараз я буду называць рухі, якія вам патрэбна зрабіць і паказваць картку з лікам, які ўказвае колькі разоў патрэбна зрабіць гэты рух.

Папляскайце ў далоні. (5)

Выканайце прысяданне. (3)

Выканайце нахілы галавы. (2)

Пастукайце рукамі па каленках. (4)

Падскокніце на месцы. (1)

Пакружыцеся. (3)

**Настаўнік.** Каб даведацца, ад каго наступнае заданне, патрэбна разгадаць шыфраванку, закрэсліць літары, якія паўтараюцца.

**АВАОАЎКА**

**Настаўнік.** Якое слова атрымалася? *(Воўк.)* А вы ведаеце чаму ваўка называюць санітарам лесу? *(Адказы вучняў.)* Воўк просіць дапамагчы яму скласці па малюнку задачу і рашыць яе.

**Настаўнік.** Гатовы дапамагчы ваўку? Але спачатку ўспомнім, з якіх частак складаецца задача?

*Вучні па малюнку складаюць задачу, запісваюць рашэнне ў сшытак.*

***Самастойная работа.***

**Настаўнік.** Сумна стала лесавіку і ён прапануе пагуляць у гульню “Матэматычны спрынт”. Спрынт – гэта бег на кароткія дыстанцыі. Перад вамі ляжаць палоскі паперы – гэта “бегавыя дарожкі”. Я чытаю прыклад, вы запісваеце толькі адказ і загінаеце ліст паперы, наступны адказ пішаце пад загнутай часткай. Перамагае той, хто дабяжыць да фініша, не зрабіўшы ніводнай памылкі.

1. Да двух дадай 1;
2. Тры плюс два гэта;
3. Шэсць мінус два
4. Сем мінус адзін.
5. Адзін плюс адзін.
6. Пяць мінус два.
7. Чатыры плюс два.

*Узаемаправерка.*

**Фізкультхвілінка для вачэй**

**Настаўнік.** Зіма рассыпала на дошцы сняжынкі. Кожная сняжынка знаходзіцца пад пэўным нумарам. Я буду называць лік, а вы вочкамі шукайце сняжынку пад гэтым нумарам.

**Настаўнік.** А якая жывёла любіць паласавацца мёдам? *(Мядзведзь.)* Наступнае заданне на палянцы пакінулі мядзведзі. Яны ўвесь час сварацца ў каго больш мёду. Давайце дапаможам вырашыць іх спрэчку і параўнаем у шклянках мёд.

*(Вучні працуюць каля дошкі.)*

**Настаўнік.** Адгадайце ад каго наступнае заданне.

Хоць малы ён, часам з кулак,
але не возьмеш ніяк. *(Вожык.)*

**Настаўнік.** Вожык на талеркі расклаў любімыя свае ласункі: яблыкі і грыбы. А колькі яблыкаў і грыбоў на кожнай талерцы, не ведае. Дапамажыце вожыку злучыць лікі з патрэбнымі талеркамі.

*Вучні выконваюць заданне на дошцы.*

**Настаўнік.** Вавёрка рашала прыклады, але не ведае правільна рашыла ці не. У лесе няма каму праверыць, таму яна просіць дапамогі ў вас.

*Вучні працуюць па картачках, на якіх запісаны прыклады. Калі ў прыкладах ёсць памылкі – выпраўляюць іх.*

3+2=4 6-2=3
7-3=4 1+1=2

**Настаўнік.** Апошняе заданне для вас падрыхтавала Мудрая сава. Яна прапануе паставіць арыфметычныя знакі ў прыкладах.

3 * 2 = 5 **(В)**
8 * 4 = 4 **(Е)**
7 * 2 = 5 **(Д)**
3 * 3 = 6 **(Ы)**

*Вучні працуюць у парах.*

**Настаўнік.** А зараз перавернем адказы ў прыкладах і прачытаем, які ж скарб мы шукалі на працягу ўрока. *(Веды.)*

**IV. Этап падвядзення вынікаў урока**

**Настаўнік.** Веды – гэта і ёсць скарб, які мы сёння здабывалі. Ваша падарожжа па краіне матэматыкі толькі пачынаецца. Старанна прайшоўшы ўсе яе дарогі, вы станеце разумнымі і кемлівымі. Старайцеся і папаўняйце запас вашых ведаў штодня. Лесавік вельмі вамі задаволены. Вы добра працавалі і справіліся з усімі заданнямі. Якое заданне было самым цяжкім? Якое заданне вам спадабалася больш за ўсё?

**V. Этап рэфлексіі.**

**Настаўнік.** Лесавік вельмі любіць любавацца кветкамі. Але зараз зіма і кветак, на жаль, няма. Я прапаную падараваць лесавічку ў знак падзякі за тое, што ён згадзіўся прыйсці да нас у госці, кветкі. Калі на ўроку было цікава і ўсё зразумела – падаруйце лесавічку чырвоную кветку, калі ўзнікалі цяжкасці – жоўтую, а калі было сумна і нічога незразумела – падарыце сінюю кветку.

**Літаратура**


1. Вершы пра лічбы [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://storojenko.usite.pro/index/vershy_pra_lichby/0-71 – Дата доступу: 11.06.2025.
2. Завадская, Н. С. Увлекательная считалочка / Н. С. Завадская. Минск : Аверсэв, 2024. – 64 с.
3. Мураўёва, Г. Л. Матэматыка. Падручнік для 1 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання 2-е выданне, перагледжанае і дапоўненае / Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2024. – 118 с.
4. Киореску, Д. И. Математика. Считай-решай. 1 класс. Рабочая тетрадь. В двух частях. Часть 1 / Д. И. Киореску. Минск : Аверсэв, 2024. – 64 с.


ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА